УДК 325.2(44)«1918/1939»

В. У. Коваль
Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт

ДЗЕЙНАСЦЬ БЕЛАРУСКАЙ ЭКАНАМІЧНАЙ ЭМІГРАЦЫІ Ў ФРАНЦЫІ Ў МІЖВАЕННЫ ПЕРЫЯД

Артыкул аналізуе маштабы эканамічнай эміграцыі беларусаў у Францыю ў міжваенны перыяд. Найбольшых маштабаў эміграцыйная хваля дасягнула ў 1920-я гады. Асноўная ўвага надаецца пытанням індывідуальнай адаптацыі і ўзроўню заробкаў беларускіх эмігрантаў у Францыі. Аўтар даследуе працэсы фарміравання і станаўлення беларускай дыяспары, міжнароднага супрацоўніцтва і развіцця нацыянальнай ідэнтычнасці ў асяродку беларусаў замежжа з 1918 па 1939 г.

У артыкуле раскрываецца сутнасць эміграцыйных працэсаў у Францыю з тэрыторыі Заходняй Беларусі. Асаблівая ўвага надаецца аналізу арганізацыйнай працы беларускіх эмігрантаў. У артыкуле апісваецца і аналізуецца роля нацыянальных палітычных арганізацый у грамадскім жыцці беларускай дыяспары. Аўтар артыкула канстатуе, што працэс легалізацыі быў дастаткова працяглы і складаны для эканамічных эмігрантаў. Даследаванне прапануецца не толькі для беларускіх гісторыкаў, але і для спецыялістаў замежжа.

Ключавыя словы: эканамічная эміграцыя, беларуская дыяспара, нацыянальная ідэнтыфікацыя, міжнароднае супрацоўніцтва, нацыянальная арганізацыя, Францыя, Заходняя Беларусь.

V. U. Koval
Belarusian State Technological University

ACTIVITIES OF BELARUSIAN ECONOMIC EMIGRATION IN FRANCE DURING THE INTER-WAR PERIOD

The article analyzes the scale of the economic emigration of Belarusians in France during the inter-war period. The largest scale emigration has reached in 1920th years. The main attention is made on the individual adaptation and the level of the salary for the Belarusian emigrants in France. The author examines the processes of the diaspora formation, international cooperation and the development of the national identity among Belarusians abroad from 1918 till 1939 years.

The article reveals the basic of the emigration process in France from West Belarus. Particular attention is paid to the analysis of the organization work among emigration. It describes and analyzes the role of the national political organization in the public life of Belarusian diaspora. The author states that the process of legalization was very long and difficult for the economic emigration. The research proposes to use not only for Belarusian historians, but also for the specialists abroad.

Key words: economic emigration, Belarusian diaspora, national identity, international cooperation, national organization, France, West Belarus.

Уводзіны. Гісторыя фарміравання беларускай дыяспары ў Францыі пачынаецца ў міжваенны перыяд, калі беларуская супольнасць пачала арганізацыйную работу па кансалідацыі эміграцыі, развіцці нацыянальнай ідэнтычнасці ў прымаючым грамадстве.

Асноўная частка. Масавая эканамічная эміграцыйная хваля беларусаў у Францыю ў вызначаны перыяд фарміравалася з ліку жыхароў Заходняй Беларусі. Афіцыйная палітыка польскіх улад стымулявала выезд беларускага насельніцва за межы Другой Рэчы Паспалітай. Асноўную масу эмігрантаў складала моладзь з ліку збяднелых малазямельных ці беззямельных сялян. Эканамічная эміграцыя беларусаў у Францыю мела пэўныя рэгіянальныя асаблівасці, аднак тэндэнцыі яе развіцця супадаюць з законамі міжваеннай эміграцыйнай хвалі. Найбольш спрыяльныя ўмовы для эміграцыі па эканамічных прычынах у краіну-рэцыпіент склаліся ў 1920-я гады. Пасля Першай сусветнай вайны Францыя атрымала ад Германіі новыя тэрыторыі, дзе востра не хапала працоўнай сілы (у тым ліку ў індустрыяльных раёнах Эльзаса і Латарынгіі), таму эмігранты першапачаткова патрабаваліся для адбудовы эканомікі рэгіёна.

Яскравыя і пераканаўчыя апісанні жыцця эканамічных эмігрантаў у Францыі былі апублікаваныя на старонках газеты “Барацьба”, якая выдавалася беларусамі ў Берліне ў 1932–1933 гг. “Галоўная маса зах.-беларускай эміграцыі ў Францыі складаецца з работнікаў. Насьледкам эканамічных і палітычных рэпрэсій на Зах. Беларусі, яны шалонамі хлынулі да Францыі дзеля пашуканьня куска хлеба. Па прыблізным падрахункам лічба зах.-беларускай эміграцыі вагаецца паміж 30–40 тысяч” [1], – пісала

газета “Барацьба” ў 1932 г. Варта адзначыць, што беларускай эміграцынай прэсе было ўласціва перабольшваць лічбы эмігрантаў у розных краінах свету. Карэспандэнты газет спецыяльна намагаліся павялічыць значэнне беларускай дыяспары пры дапамозе больш значнай колькасці яе прадстаўнікоў, якую яны пазначалі ў сваіх артыкулах.

Эміграцыя ў Францыю мела сталы і сезонны характар. Колькасць беларускіх эмігрантаў у прымаючым грамадстве не была стабільнай. Складанасць у падліках беларусаў у Францыі звязана з пытаннем нацыянальнай ідэнтычнасці жыхароў Заходняй Беларусі, бо далёка не ўсе з іх лічылі сябе беларусамі па нацыянальнасці. Афіцыйныя польскія дакументы не ствараюць поўную карціну эміграцыі, там прысутнічаў падзел эмігрантаў па веравызнанні, аднак не было падзелу на нацыянальнасці. Веравызнанне эмігрантаў сучасным даследчыкам таксама не дае дакладных адказаў. Сярод праваслаўных Заходняй Беларусі не ўсе ідэнтыфікавалі сябе беларусамі, разам з тым, не ўсе каталікі беларускіх ваяводстваў з’яўляліся палякамі, сярод іх было нямала беларусаў. Па прыблізных падліках колькасць беларусаў, якія выехалі ў міжваенны час у Францыю па эканамічных прычынах, складала каля 20 000 чалавек.

Значная частка беларусаў у Францыі працавала ў сельскай гаспадарцы, уладкоўвалася на вінаградніках ці цукровых заводах, была асабліва запатрабаванай у перыяд палявых работ. Эмігранты, якія працавалі ў галіне сельскай гаспадаркі Францыі, атрымоўвалі заробкі ў 2–3 разы меншыя, чым прамысловыя рабочыя. Значная частка эмігрантаў-сялян шукала магчымасці змяніць сваю сельскагаспадарчую работу на працоўнае месца ў прамысловасці. Каб не дапусціць росту сацыяльнага напружання ў грамадстве, французскае Міністэрства ўнутраных спраў 30 лістапада 1926 г. выдала дэкрэт пра забарону іншаземным сельскагаспадарчым работнікам мяняць месца працы на працаўладкаванне ў прамысловаці [2]. Увядзенне закона паўплывала на рээміграцыйны рух некаторай часткі беларусаў, якія расчараваліся ў магчымасці замежных заробкаў.

Частка беларусаў у Францыі працавала ў прамысловасці краіны і сферы абслугоўвання. Нярэдка эмігрантаў бралі на фізічна цяжкую ці малааплачваемую працу. Фізічна выносныя мужчыны працавалі шахцёрамі, чорнарабочымі на металургічных заводах, на прадпрыемствах па здабыванні жалезнай руды. Некаторыя эмігранты ўладкоўваліся на фабрыкі і заводы, працавалі на прадпрыемствах па вырабу штучнага шоўку, іх актыўна наймалі на будоўлі, а таксама на работу па меліярацыі зямлі ў балоцістай мясцовасці [3]. Жанчыны атрымоўвалі працу абслуговага персаналу ў прыватных маёнтках ці гатэлях, а таксама месца рабочых на фабрыках.

Варта падкрэсліць, што беларускія эмігранты размяркоўваліся па краіне, згодна з размяшчэннем французскіх селькагаспадарчых і індустрыяльных цэнтраў. Эміграцыйная газета “Барацьба” ўдакладняе найбольш буйныя беларускія калоніі: “Іх галоўныя асяродкі разьмешчаны па галоўным індустрыяльным раёнам Францыі. Найбольшая скупчанасьць прыпадае на раёны паўночнай Францыі: Ліль, Рубэ, Падэ-Калэ; затым ідзе ўсходняя Францыя: Мосэй, Эльзас, Лётарынгія і далі: Ліён-Сан, Трацьен, Парыж, дэпартамэнт Гард (недалёка ад Марселю), Бордо, Гавр і т. д. Прыблізна ¼ беларускай эміграцыі працуе ў сельскай гаспадарцы, найскупчанейшым раёнам якой ёсьць Тулюза (паўднёвая Францыя). У раёне Марсель-Нім-Арль вырабілася профэсіянальная група сэзоньнікаў, якія канчаючы жніва, пераходзяць на зборку віна, т. зв. "вананс", а затым апрацоўкай марской солі, сэзон якой пачынаецца прыблізна ў канцы верасьня” [4]. Такім чынам, у Францыі аформіліся пэўныя раёны, дзе склаліся спрыяльныя ўмовы для кансалідацыі беларускіх эмігрантаў.

Для працы ў Францыі агенты ў Заходняй Беларусі вербавалі пераважна маладых асоб, якія змаглі б вытрамаць складаныя ўмовы эміграцыі. Інфармацыя пра рэкрутацыю выезду размяшчалася ў выглядзе плакатаў. Для адбору на працу ў Францыю звычайна запрашаліся мужчыны ва ўзросце ад 21 да 40 гадоў, незамужнія маладыя жанчыны ці сем’і для работы ў сельскай гаспадарцы [5]. Жадаючыя легальна выехаць на заробкі ў Францыю праходзілі жорсткі адбор, бо пры найманні рабочай сілы ўважліва ставіліся да фізічнага здароўя кандыдатур.

Абмежаванні пры вярбоўцы ў Францыю сталі прычынай шматлікіх ашуканстваў, былі распрацаваныя цэлыя схемы афер з фальшывымі запрашэннямі і кантрактамі. Прычынай распаўсюджвання нелегалаў як з’явы ва ўнутрыкантынентальнай эміграцыі стала тэрытарыяльная блізкасць да прывабнай у эканамічным плане краіны-рэцэпіента, калі асобы маглі самастойна здзейсніць падарожжа. Найбольш знаходлівыя эмігранты выкарыстоўвалі легальную магчымасць для афармлення дакументаў, якія дазвалялі перасекчы мяжу. Напрыклад, жадаючыя выехаць у Францыю ў Консульстве афармлялі візы для ўдзелу ў міжнародных парыжскіх выставах [6], пасля чаго заставаліся ў краіне зарабляць грошы нелегальна. У падобных выпадках Эміграцыйны сіндыкат намагаўся дзейнічаць супольна з Консульствам Францыі ў

Другой Рэчы Паспалітай для спынення хвалі нелегалаў, аднак іх меры прымаліся не заўсёды своечасова і аператыўна.

Цікавым пытаннем для даследавання сталі фінасавыя ўмовы эміграцыі ў Францыю. Пры вярбоўцы эмігрантаў агенты дамаўляліся, што аплата дарогі будзе ўлічвацца ў кошт будучага заробку. Прадстаўнікі эканамічнай эміграцыі пагаджаліся на такія ўмовы, бо першапачаткова ў іх не было грошай нават на чыгуначны білет. Працоўны дзень у сярэднім складаў 10 гадзін, пры гэтым сезонная праца ў сельскай гаспадарцы магла быць больш працяглай да 14–16 гадзін. Эміграцтны атрымоўвалі ніжэйшы заробак за французаў на аднолькавых работах, менавіта таму яны былі вымушаныя працаваць звыш нормы. Варта падкрэсліць, што 8-гадзінны працоўны дзень мелі толькі шахцёры.

Як ужо адзначалася, заробкі эмігрантаў на прамысловых прадпрыемствах былі значна вышэйшымі за тых, хто працаваў у сельскай гаспадарцы. Беларусаў прымушалі падпісваць кантракт, які звычайна ставіў іх у няроўныя ўмовы з французамі. Кожны працоўны з такім кантрактам меў заробак на 30–40% ніжэйшы, чым аўтэхтоннае насельніцтва. У 1930-я гады распаўсюджанай практыкай стала выплата меншых сум, чым пазначалася ў кантракце.

Кантракт для эканамічных эмігрантаў быў не адзіным патрэбным дакументам для паспяховай легалізацыі ў Францыі. Асобам неабходна было аформіць яшчэ працоўную ідэнтыфікацыйную карту. Афармленне карты было няпростай справай, аднак без дакументаў уладкавацца на працу не дазвалялася: “Дзеля таго, каб мець права на працу, а гэта значыць дастаць "карт д’ідэнцітэ", необходна скончыць было кантракт. Карта выдаецца ня больш, як на два гады. Цяпер, у зьвязку з крызісам, кожны эмігрант, які пражыў менш пяці год у Францыі, пры абмене такой карты мусіць знайсьці і падпісаць новы кантракт” [7]. Працоўная карта дакладна абмяжоўвала сектар вакансій, бо з сельскагаспадарчай картай асоба не мела права ўладкавацца на працу ў прамысловасці.

Ігнараванне французскіх законаў не толькі стварала праблемы ў момант працаўладкавання, але і пагражала рэальным пакараннем. Напрыклад, пры аднаўленні пратэрмінаванай працоўнай ідэнтыфікацыйнай карты эмігранты штрафаваліся. Складанасці легалізацыі для беларусаў у Францыі перашкаджалі псіхалагічнай адаптацыі асоб, прымушалі іх яднацца ў саюзы і арганізацыі, каб разам імкнуцца да вырашэння праблем з падпісаннем кантрактаў ці афармленнем карт.

Сусветны эканамічны крызіс негатыўна адбіўся на эміграцыйнай кан’юнктуры, а з сярэдзіны 1930-х гадоў праводзілася масавая дэпартацыя эмігрантаў з тэрыторыі Францыі. Больш спрыяльнымі гадамі для эканамічнай эміграцыі ў краіну сталі 1920-я гады, калі Францыя адбудоўвала гаспадарку і прамысловасць пасля разбурэнняў Першай сусветнай вайны. Аднак нават у адзначаны перыяд рэальныя заробкі эмігрантаў не былі неверагодна высокімі, пра што сведчаць матэрыялы прэсы за 1927 год: “J zahraničny pan tak jak i swoj starajecca wykarystać našaha brata pracu, bo za rabotnikaŭ wializarnuju pracu daje tolki na pražyŭleńnie pa 20 frankaŭ u dzień, z jakich za charčy treba zapłacić 15 fr., za kwateru 3 fr., astajecca 2 fr., za katoryja treba prakarmić žonku i dzaciej, jakija astalisia ŭ kraju” [8]. Развагі беларуса ў Францыі дэманструюць рэальнае становішча эканамічных эмігрантаў, яны фактычна развенчваюць міф пра замежныя заробкі, які сфарміраваўся ў грамадскай свядомасці жыхароў Заходняй Беларусі. Газета “Беларуская Крыніца” сістэматычна публікавала лісты беларускіх эмігрантаў з розных краін свету, дзе падрабязна апісваліся іх праблемы і цяжкасці.

Беларускамоўная віленская прэса намагалася супрацьстаяць польскай прапагандзе па заахвочванні эміграцыі. На цяперашні момант цяжка ацаніць ступень уплыву атрыкулаў газет на чытацкую аўдыторыю, хаця матэрыялы былі дастаткова эмацыйныя і пераканаўчыя, з пэўнымі фактамі і развагамі. Тыповым прыкладам жыцця эміграцыі ў Францыі з’яўляецца матэрыял з газеты “Сын Беларуса”: “Дык вось, што піша мне знаёмы з Францыі: На эмігрантаў у Францыі глядзяць бадай што, як на рабоў, і надта ня любяць, калі хто-небудзь з гэтых "рабоў" ведае французскую мову. Кожны павінен падпісаць кантракт ці ўмову і да вызначанага часу жыве ў лагеры без права выхаду. Плата значна меншая, чым нават можна было спадзявацца” [9]. Матэрыял газеты павінен быў падрыхтаваць чытачоў да несправядлівага стаўлення ў эміграцыі, да іх расчаравання ў памерах заробкаў. Дастаткова часта ў апісаннях лёсаў эмігрантаў выдаўцы прэсы выкарыстоўвалі лісты, бо апублікаваная карэспандэнцыя найбольш пераканаўча ўплывала на чытачоў, пазбаўляла іх міфаў пра лёгкія і вялізныя заробкі за мяжой.

Беларуская эміграцыя ў Францыі вызначылася сваёй арганізаванай дзейнасцю па абароне ўласных эканамічных інтарэсаў, найбольш паспяхова гэта праца праводзілася ў 1930-я гады. Нягледзячы на тое, што эмігранты спрабавалі арганізавацца значна раней, фактычна іх ініцыятыва не рэалізавалася. У эміграцкай прэсе засталіся аналітычныя матэрыялы пра ступень актыўнасці беларускай дыяспары

ў Францыі: “Ня ведаючы французкае мовы, беларускія рабочыя ня мелі магчымасьці наладзіць цесны кантакт з французкімі рабочымі профсаюзамі, а спробы стварыць свае ўласныя арганізацыі доўга не ўдаваліся” [3]. Яшчэ адной прычынай беспаспяховых спроб развіцця беларускіх арганізацый у 1920-я гады стала адступнасць арганізацыйнага вопыту ў лідараў дыяспары, бо большасць з іх была тыповымі прадстаўнікамі эканамічнай эміграцыйнай хвалі, без адмысловай адукацыі і досведу грамадскай дзейнасці.

Беларускія эмігранты, якія вызначыліся спробамі абароны сваіх правоў ў Францыі, мелі пэўны палітычны вопыт барацьбы ў змаганні з польскімі ўладамі ў Заходняй Беларусі. З другой паловы 1920-х гадоў беларускія сяляне і працоўныя ў Францыі пачалі ствараць нацыянальныя арганізацыі і гурткі. У канцы 1928 г. беларускі гурток ствараецца ў Парыжы, у гэтым жа годзе ўзнікае беларускі гурток з 12 рабочых у невялічкім мястэчку Верпелье [10]. Беларускія аддзелы і гурткі пачынаюць працу з канца 1920-х гадоў пры польскіх, украінскіх і французскіх арганізацыях. Нягледзячы на першапачатковы ўздым палітычнай актыўнасці, на пачатковым этапе сваёй арганізацыі беларускія аб’яднанні хутка зніклі. Свае палітычныя няўдачы і пралікі самі эмігранты тлумачылі наступным чынам: “Паясніць гэта лёгка па першае незнаёмствам умоў новай і чужой краіны, а па другое бракам выраблена актыву, які-б хутчэй з’ар’ентаваўся ў абставінах” [11]. Няўдалы палітычны вопыт беларусаў канца 1920-х гадоў можна таксама звязаць са слабой кансалідаванасцю беларускай дыяспары ў Францыі, адсутнасцю фінансавай базы для яе палітычнага развіцця, недахопам інтэлігенцыі.

Самай актыўнай і значнай арганізацыяй беларускай дыяспары ў міжваенны час стаў “Хаўрус беларускіх работнікаў у Францыі”. Арганізацыя была створана ў Парыжы ў верасні 1930 г., яе філіялы дзейнічалі ў Віянкуры, Марселі, Эльзасе, Нордзе, Ліёне, Гардзе, асобныя гурткі “Хаўрусу” працавалі на Корсіцы, у Пондэ Шэры, Мантаржы**.** Актыўнасць “Хаўрусу” беларускіх работнікаў у Францыі была няроўнай, часам спадала зусім. Праблемай для арганізацыі заўсёды заставалася слабая кансалідацыя беларускіх эмігрантаў, іх нізкая палітычная актыўнасць. Напрыклад, “Хаўрус” фактычна бяздзейнічаў у 1931 г., не маючы падтрымкі беларусаў з іншых краін свету, без сталай сувязі з палітычнымі цэнтрамі Заходняй Беларусі, але ў 1932 г. праца зноў пачала ажываць [12] і развівацца да акупацыі краіны ў Другой сусветнай вайне. Аб’яднанне эканамічных эмігрантаў у Францыі існавала больш за дзесяцігоддзе, што дазваляе зрабіць выснову пра яе запатрабаванасць і значнасць.

“Хаўрус” выдаваў свой часопіс у Парыжы пад назвай “Бюлетэнь "Хаўрусу" беларускіх работнікаў у Францыі”, дзе публікаваліся навіны і матэрыялы пра дзейнасць беларускай дыяспары. Арганізацыя паспяхова праводзіла адукацыйную дзейнасць у асяродку эканамічных эмігрантаў, былі адкрыты спецыяльныя курсы для дарослых, дзе слухачоў вучылі вядзенню гаспадаркі, гісторыі Беларусі, беларускай мове і г. д.

Акрамя “Хаўрусу” ў Францыі дзейнічалі іншыя арганізацыі беларусаў, пра якія засталося мала звестак, што ўскладняе ацэнку іх ролі і ўплыву на супольнасць замежжа. З віленскай прэсы вядома, што бурна адгукнулася на несправядлівы прысуд польскіх улад над Б. Тарашкевічам “Культурна-асветная арганізацыя імя Б. Тарашкевіча ў г. Саломін” [13], якая была створана беларускімі сялянамі і рабочымі з ліку эмігрантаў. Пра дзейнасць таварыства пісала не толькі беларуская прэса (газеты “Барацьба” і “Родны край”), але і перыёдыка іншых славянскіх дыяспар, асаблівую ўвагу на арганізацыю звяртала ўкраінская газета “Голас украінскіх работнікаў”.

Эканамічная міжваенная эміграцыя ў Францыю яскрава дэманстравала гендэрную няроўнасць за мяжой. Жанчыны-эмігранткі траплялі ў значна больш складаныя ў эканамічным плане ўмовы: “Шчэ ў больш варварскай эксплёатацыі знаходзіцца жанчына. Пры агульнай ніжэйшай аплаце яе працы на фабрыцы, яна яшчэ ў больш дзікіх формах прыгоблена пры выкарыстаньні яе, як дамашняй прыслугі. Толькі ў вялікіх гатэлях датрымліваецца 10-ці гадз. рабочы дзень і адзін выхадны дзень у тыдзень. У рэшты-ж дамох, т. зв. "мэзон дэ буржуа", дзе і працуюць на 80% нашы жанчыны, рабочы дзень рахуецца аж да 16 гадз., а выхадны час – 3 гадз. на тыдзень пры нізкай месячнай зарплаце” [14]. На медыцынскую дапамогу можна было разлічваць толькі ў выпадку сур’ёзнай траўмы ці няшчаснага здарэння на працоўным месцы. Беларускія жанчыны таксама спрабавалі праявіць сваю палітычную актыўнасць, у 1938 г. значных поспехаў у арганізацыйнай справе дасягнула Беларуская жаночая грамада ў Парыжы, якая ладзіла культурныя вечарыны і паспяхова супрацоўнічала з арганізацыямі ўкраінскай дыяспары.

Заключэнне. Такім чынам, беларускія эканамічныя эмігранты ў Францыі сустракаліся са складанасцямі легалізацыі ў прымаючым грамадстве, што тлумачылася заканадаўствам краіны-рэцыпіента. Адметных поспехаў у арганізацыйнай справе беларусы

дасягнулі ў другой палове 1930-х гадоў, калі атрымалі пэўны палітычны вопыт у абароне эканамічных інтарэсаў. Віленская прэса намагалася супрацьстаяць польскай агітацыі па заахвочванні эміграцыі, на яе старонках публікаваліся матэрыялы пра складанасці індывідульнай і псіхалагічнай адаптацыі ў Францыі. Разам з тым эканамічная эміграцыйная хваля беларусаў у Францыю мела масавы характар.

Літаратура

1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 458. Воп. 1. Спр. 182.
2. Качараба С. П. Еміграція з Західної України 1919–1939. Львів: Львівський національний університет імені Івана Франка, 2003. С. 341.
3. Берлінец. Працоўная беларуская эміграцыя ў Заходняй Эўропе пачынае арганізоўвацца // Беларуская школа ў Латвіі. 1932. № 7. С. 251.
4. НАРБ. Ф. 458. Воп. 1. Спр. 182.
5. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). Ф. 2082. Воп. 1. Спр. 102.
6. ДАБВ. Ф. 1. Воп. 4. Спр. 1335.
7. НАРБ. Ф. 458. Воп. 1. Спр. 182.
8. Monski J. Dola Biełaruskaha emihranta // Biełaruskaja Krynica. 1927. № 34. S. 3.
9. Запольскі М. Пісьмы з Сэрбіі // Сын Беларуса. 1924. № 32. С. 4.
10. НАРБ. Ф. 458. Воп. 1. Спр. 182.
11. М. Л. Зах.-бел. эміграцыя ў Францыі // Барацьба. 1932. № 2. С. 4.
12. НАРБ. Ф. 458. Воп. 1. Спр. 182.
13. У Францыі. Т-ва ім. Б. Тарашкевіча // Родны край. 1933. № 6. С. 6.
14. НАРБ. Ф. 458. Воп. 1. Спр. 182.

References

1. National Archives of the Republic of Belarus (NARB). Fund 458. I. 1. F. 182.
2. Kacharaba S. P. *Emigratsiya z Zakhidnoy Ukrainy 1919–1939* [Emigration from West Ukraine 1919–1939]. Lviv, Lvivskiy natsional'nyy universitet imeni Ivana Franka Publ., 2003. P. 341.
3. Berlinets. Labour Belarusian emigration in West Europe is beginning to organize. *Belaruskaya shkola u Latvii* [Belarusian school in Latvia], 1932, no 7, p. 251 (In Belarusian).
4. NARB. Fund 458. I. 1. F. 182.
5. State Archives of Brest Region (SABR). Fund 2082. I. 1. F. 102.
6. SABR. Fund 1. I. 4. F 1335.
7. NARB. Fund 458. I. 1. F. 182.
8. Monski J. Fate of the Belarusian emigrant. *Belaruskaya Krynitsa* [Belarusian Source], 1927, no. 34, p. 3 (In Belarusian).
9. Zapol'ski M. Letters from Serbia. *Syn Belarusa* [Son of Belarusian], 1924, no. 32, p. 4 (In Belarusian).
10. NARB. Fund 458. I. 1. F. 182.
11. M. L. West Belarusian emigration in France. *Barats'ba* [Struggle], 1932, no 2, p. 4 (In Belarusian).
12. NARB. Fund 458. I. 1. F. 182.
13. In France. Association named after B. Tarashkevich. *Rodny kray* [Native land], 1933, no. 6, p. 6 (In Belarusian).
14. NARB. Fund 458. I. 1. F. 182.

Інфармацыя пра аўтара

Коваль Вольга Уладзіміраўна – кандыдат гістарычных навук, старшы выкладчык кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі. Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт (220006, г. Мінск, вул. Свярдлова, 13а, Рэспубліка Беларусь). E-mail: sunny_san@rambler.ru

Information about the author

Koval Volha Uladzimirauna – PhD (History), Senior Lecturer, the Department of History of Belarus and Political Science. Belarusian State Technological University (13a, Svyardlova str., Minsk, Republic of Belarus). E-mail: sunny_san@rambler.ru

Паступіў 04.09.2017